**Ждановіч, А**. Афганістан – асобая старонка жыцця / А. Ждановіч // Веснік Глыбоччыны. — 2009. — 14 лют. — С. 2.

## АФГАНІСТАН – АСОБАЯ СТАРОНКА ЖЫЦЦЯ

Ідуць гады... Падзеі 30-гадовай даўнасці адыходзяць у мінулае, але памяць падчас вяртае ў тое далёкае, з такой выразнасцю аднаўляючы ўсё да драбніц.

Цяпер, напярэдадні 20-годдзя вываду савецкіх войскаў з Афганістана, я не магу не ўспомніць 1979 год, у якім з'явілася паняцце «інтэрнацыянальны абавязак». Упершыню пра Афганістан пачуў у канцы красавіка 1979 года, адразу па прыбыцці для праходжання службы пасля заканчэння вучэбнага падраздзялення паветрана-дэсантных войск у 105-ю гвардзейскую Венскую паветрана-дэсантную дывізію, размешчаную ў Туркестанскай ваеннай акрузе. Ужо ў красавіку 1979 года гэтая дывізія рыхтавалася да абароны інтарэсаў афганскай Красавіцкай рэвалюцыі на тэрыторыі суседняй дзяржавы. Палкі нашай паветрана-дэсантнай дывізіі размяшчаліся ў горадзе Фергана. Павышаная баявая гатоўнасць часцей паветрана-дэсантнай дывізіі працягвалася месяцамі, неаднаразова мы знаходзіліся на аэрадромах у поўнай гатоўнасці да вылету і дэсанціравання на тэрыторыю сумежнай дзяржавы. У канцы чэрвеня 1979 года на аэрадром Баграма быў перакінуты адзін батальён нашай паветрана-дэсантнай дывізіі, а ў верасні – нашу дывізію расфарміравалі. Частку афіцэраў і салдат, прайшоўшых баявую падрыхтоўку для правядзення ваенных аперацый ва ўмовах горна-пустыннай мясцовасці, накіравалі для праходжання далейшай службы на тэрыторыі ГДР, Беларусі, Казахстана. Пасля расфарміравання 105-й гвардзейскай Венскай паветрана-дэсантнай дывізіі на тэрыторыі Туркестанскай ваеннай акругі ў Фергане застаўся 345-ы асобны парашутна-дэсантны полк, адзін батальен якога знаходзіўся з чэрвеня ў Афганістане. У горадзе Чырчык была сфарміравана 56-я дэсантна-штурмавая брыгады. У складзе гэтай брыгады я прадоўжыў службу намеснікам камандзіра ўзвода разведкі. Працягвалася падрыхтоўка да вядзення баявых дзеянняў ва ўмовах горнай мясцовасці. У ротах праходзілі партыйныя і камсамольскія сходы, на якіх абмяркоўваліся пытанні неабходнасці аказання ваеннай дапамогі афганскай рэвалюцыі. Ужо ў 1979 годзе абмяркоўвалася пытанне аб тым, што калі мы своечасова не прыйдзем у Афганістан, там будуць войскі НАТА, што ў далейшым поўнасцю пацвердзілася.

Нам, салдатам і афіцэрам, якія праходзілі службу ў паветрана-дэсантных войсках на тэрыторыі Туркестанскай ваеннай акругі і больш паўгода знаходзіліся ў стане павышанай баявой гатоўнасці, як нікому іншаму, было зразумела, наколькі няпроста прымалася рашэнне ў вышэйшых эшалонах улады аб уводзе абмежаванага кантынгенту войск у Афганістан.

Гісторыя расстаўляе ўсё па сваіх месцах, але і зараз, зыходзячы з інтарэсаў вялікай дзяржавы пад назвай «Савецкі Саюз» мы разумеем, – у гэтым была неабходнасць.

Вайна – гэта цяжкая работа, колькі б да яе не рыхтаваліся. Можна прывыкнуць да цяжкіх бытавых умоў, да разрываў артылерыйскіх снарадаў у час артпадрыхтоўкі перад наступленнем на кішлак, заняты маджахедамі, да невыноснай спякоты, недахопу вады, навучыцца дазіравана ўжывадь ваду на прывалах у час рэйду па пясках або гарах у пошуках караванаў са зброяй, але ніяк нельга прывыкнудь да страт сяброў, баявых таварышаў. Якое пачуццё зведваеш, калі заходзіш у ангар, запоўнены цынкавымі трунамі ў драўляных скрынках або назіраеш абстрэл душманскімі ракетамі самалёта Ан-12 з грузам «200» на барту!!!

Канешне, вайна робіць жорсткімі душы, перанапружвае нервовую сістэму маладых хлопцаў, іншы раз даводзіць да нервовага зрыву ўжо ў мірнай абстаноўцы.

Я не магу скардзіцца на лёс. Дзякуючы доўгай падрыхтоўцы яшчэ да ўводу ў Афганістан, а таксама дзякуючы камандзірам, у нас былі мінімальныя страты пры правядзенні баявых аперацый. Я ўпэўнены, што мая мама, Уладзіслава Баляславаўна, якой ужо няма ў жывых, а здароўе яе было вельмі падарвана ў час маёй службы ў Афганістане, у літаральным сэнсе вымаліла ў Бога маё вяртанне дамоў жывым.

Я ўдзячны лёсу, што нарадзіўся і вырас на Глыбоччыне. Пасля вяртання дамоў, у мірнае жыццё, мне была аказана адпаведная падтрымка ў прафесійным росце з боку кіраўнікоў раёна – В. І. Акуленкі, Е. І. Сініцкага, кіраўніцтва РАУС – І. П. Атвалкі, Д. К. Грыневіча, кіраўніка ПМК-46 І. І. Рындзёнка, дасягнуў адпаведных вышынь у жыцці, займаў кіруючыя пасады, у званні палкоўніка міліцыі выйшаў у запас. Жыццё працягваецца. Веды, вопыт, загартоўка, атрыманыя на апаленай ванной зямлі Афганістана, запатрабаваны і зараз.

На тэрыторыі Глыбоцкага раёна не было воінскіх часцей, якія б непасрэдна накіроўваліся на афганскую вайну, як гэта было ў Віцебску, адкуль накіравана 103-я гвардзейская і паветрана-дэсантная дывізія. Больш сотні глыбачан прайшлі апаленымі дарогамі Афганістана. Не ўсім было суджана вярнуцца жывымі дамоў. Першыя цынкавыя труны прыйшлі ў раён ужо летам 1980 года. Сярод загінуўшых – Аляксандр Якаўлевіч Дзехцяроў (1960–1980), Леанід Веньямінавіч Сандзюк (1962–1982), Дзмітрый Валянцінавіч Батура (1964–1984), Аляксандр Пятровіч Чаронка (1965–1984), Раман Іосіфавіч Мацяюн (1958–1987).

Выдатна, што на тэрыторыі Глыбоцкага раёна была камсамольская арганізацыя, якую ўзначальваў М. П. Чарапкоўскі і якая ў ліку самых першых у Беларусі прыняла меры па згуртаванні ветэранаў афганскай вайны ў грамадскую арганізацыю. Дзякуючы гэтаму мы ведаем: нас памятаюць. Аб гэтым сведчыць адзін з самых прыгожых у Рэспубліцы Беларусь помнікаў воінам-афганцам, які ўстаноўлены ў парку «Перамогі» горада.

**А. Ждановіч**,
старшыня Глыбоцкай раённай і
намеснік старшыні абласной арганізацыі
ветэранаў вайны ў Афганістане